*пускаць у свет, пускаць на той свет* і інш.), *лезці* – у 26 (*лезці ў вочы, лезці на ражон, хоць жывы ў зямлю лезь*) і інш.

Дзеяслоўныя фразеалагізмы ў беларускай літаратурнай і дыялектнай мове прадстаўлены не толькі ў вялікай колькасці, але і шматлікія паводле структуры, семантыкі, апорнага дзеяслова, ужывання ў вуснай форме маўленчай дзейнасці чалавека, у творах мастацкай літаратуры, публіцыстыкі, сталі пранікаць у навуковыя тэксты.

**Літаратура**

1 Лепешаў, І. Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1998. – 271 с.

***Н. М. Яфіменка***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## ПЕЙЗАЖНА-ПАТРЫЯТЫЧНАЯ ЛІРЫКА НІЛА ГІЛЕВІЧА

Пейзажная лірыка мае свае разнавіднасці, сярод якіх – уласна прыродаапісальная, дзе пераважае эстэтычны погляд, любаванне краявідамі; пейзажна-патрыятычная, якая выяўляе пачуццё гонару і любові да Радзімы; пейзажна-публіцыстычная, або экалагічная, і натурфіласофская, дзе пейзаж – аб'ект філасофскага роздуму. У творчасці Н. Гілевіча выявіліся ўсе гэтыя віды. Пра пейзажна-патрыятычныя вершы паэта Г. Сіненка заўважае: "У 60-я гады ў паэзіі Н. Гілевіча выяўляецца паглыбленае філасофскае асэнсаванне дыялектычнай сувязі чалавека і прыроды. Прырода цяпер не толькі фон, – яна арыгінальная састаўная частка ў канцэпцыі асобы лірычнага героя" [1, с. 92]. Верш "Край мой беларускі" выклікае патрыятычныя пачуцці, гонар за сваю Радзіму, яе народ. Цэнтральны вобраз створаны з дапамогай персаніфікацыі: "Край мой беларускі, край! // Дай ты мне паслухаць, дай! // Як на лад пявучы // Старажытнай мовы // Тут гамоняць пушчы, // Там шумяць дубровы…" [2, с. 98]. Стылёвую адметнасць паэтычнага таленту Н. Гілевіча падкрэслівае верш "Зямля бацькоў, Лагойшчына мая...", які характарызуецца высокім грамадзянскім гучаннем. Пейзажна-патрыятычны пачатак спалучаецца з пейзажна-публіцыстычным. Праз родныя краявіды паказаны смутак лірычнага героя па загінуўшых сябрах. У вершы гучыць катэгарычнае непрынянцце зла, якое несла фашысцкая навала. Падобнае заўважаецца і ў вершы "Ёсць зямля…" – трывожнай паэтычнай медытацыі пра лёс Радзімы, якую абражалі чужакі ды іхнія тутэйшыя паслугачы. Першы катрэн – лірычнае прызнанне ў любові да роднай краіны, якая паўстае адухоўленай жывой істотай: "…з чыстымі, як у дзіцяці, вачыма // І з даверлівай, як у дзіцяці, душой" [3, с. 164].

Такім чынам, у пейзажна-патрыятычнай лірыцы Н. Гілевіча гучыць пачуццё бязмежнай любові да Радзімы, яе духоўнай спадчыны і мовы. Праз пейзаж аўтар выказвае разуменне падзей і з'яў, ацэньвае іх з пазіцыі паэта-патрыёта. Улюбёны прыём паэта ў такіх вершах – персаніфікацыя.

**Літаратура**

1 Сіненка, Г. Д. Ніл Гілевіч: Нарыс творчасці / Г. Д. Сіненка. – Мінск : Выш. школа, 1981. – 270 с.
2 Гілевіч, Н. Запаветнае: лірыка / Н. Гілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1975. – 192 с.
3 Гілевіч, Н. Выбраныя творы / Ніл Гілевіч. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 600 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ